УДК 94(476)

І.А. Андарала, канд. пед. навук, дац. (БДТУ, г. Мінск)

# СТАН ПЕДАГАГІЧНАЙ АДУКАЦЫІ БЕЛАРУСІ (1943–1950 гг.)

Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны падрыхтоўку настаўнікаў для агульнаадукацыйных школ Беларусі ажыццяўлялі 32 педагагічныя навучальныя ўстановы: 5 педагагічных інстытутаў, 9 настаўніцкіх інстытутаў і 18 школьных педагагічных вучылішчаў. У педагагічных і настаўніцкіх інстытутах адпаведна навучалася 3276 і 2088 студэнтаў [1, л. 31]. Усе педагагічныя навучальныя ўстановы мелі дзённае і завочнае аддзяленні, размяшчаліся ў асобных вучэбных будынках з добрай вучэбна-матэрыяльнай базай, былі забяспечаны неабходнай вучэбнай і мастацкай літаратурай. Аб паспяховай дзейнасці сістэмы педагагічнай адукацыі сведчыць той факт, што большасць з 60 724 настаўнікаў, якія працавалі ў школах рэспублікі ў 1940/41 навучальным годзе, мелі сярэднюю і вышэйшую педагагічную адукацыю [2, л. 186].

У сувязі з пачаткам Вялікай Айчыннай вайны і акупацыяй тэрыторыі Беларусі нямецка-фашысцкімі захопнікамі ўсе педагагічныя навучальныя ўстановы вымушаны былі прыпыніць сваю дзейнасць.

Хуткае аднаўленне сеткі школ на вызваленай ад акупантаў тэрыторыі рэспублікі выключна абвастрыла праблему наяўнасці педагагічных кадраў. Многія настаўнікі загінулі ў час акупацыі, на фронце, у партызанскіх злучэннях, былі вывезены на працу ў Германію, знаходзіліся ў эвакуацыі. Гэта акалічнасць патрабавала хутчэйшага аднаўлення дзейнасці педагагічных, настаўніцкіх інстытутаў і педагагічных вучылішчаў.

Дзякуючы намаганням партыйна-савецкіх улад БССР, значнай арганізацыйнай рабоце, праведзенай Наркамасветы рэспублікі, педагагічныя навучальныя ўстановы пачалі падрыхтоўку настаўніцкіх кадраў ужо ў 1943 годзе, калі на тэрыторыі рэспублікі яшчэ ішлі баявыя дзеянні.

Так, вучэбныя заняткі ў Мсціслаўскім педагагічным вучылішчы пачаліся з 1 снежня 1943 года, у Рэчыцкім – з 1 лютага, у Гомельскім – з 15 лютага 1944 года. У гэтых трох педагагічных вучылішчах навучалася 885 чалавек. Адпаведна ў Мсціслаўскім – 394, Гомельскім – 288, Рэчыцкім – 203 навучэнцы [2, л. 292].

У 1944/45 вучэбным годзе падрыхтоўку настаўнікаў пачатковых класаў ужо ажыццяўлялі 22 школьныя педагагічныя вучылішчы. На

пачатак вучэбнага года агульная колькасць навучэнцаў на трох курсах усіх педагагічных вучылішчаў складала 6810 чалавек [3, л. 87].

Першым з вышэйшых педагагічных устаноў у Мазыры 15 сакавіка 1944 г. аднавіў сваю дзейнасць Рагачоўскі настаўніцкі інстытут у складзе трох аддзяленняў з кантынгентам студэнтаў 210 чалавек [4, л. 10–12].

31 мая 1944 г. урад рэспублікі прыняў рашэнне аб аднаўленні дзейнасці Гомельскага педагагічнага (чатыры факультэты) і настаўніцкага (два аддзяленні) інстытутаў [5, л. 36].

Важнае значэнне для забеспячэння агульнаадукацыйных школ рэспублікі настаўніцкімі кадрамі мела рашэнне СНК БССР ад 29 ліпеня 1944 г. аб узнаўленні дзейнасці Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя А. М. Горкага ў складзе пяці факультэтаў і настаўніцкага інстытута пры ім (два аддзяленні). Планы прыёму ў інстытуты на дзённую форму навучання ў 1944/45 вучэбным годзе былі ўстаноўлены адпаведна – 450 і 250 чалавек, на завочныя аддзяленні – 850 чалавек [4, л. 261].

Пасля поўнага вызвалення тэрыторыі рэспублікі ад захопнікаў працэс аднаўлення дзейнасці педагагічных і настаўніцкіх інстытутаў прадоўжыўся. У 1944/45 вучэбным годзе падрыхтоўку педагаічных кадраў ажыццяўлялі 5 педагагічных (Віцебскі, Гомельскі, Гродзенскі Мінскі, Магілёўскі) і 7 настаўніцкіх (Аршанскі, Віцебскі, Гомельскі, Мінскі, Магілёўскі, Мазырскі, Пінскі) інстытутаў. Усяго да заняткаў у педагагічных і настаўніцкіх інстытутах у 1944/45 вучэбным годзе прыступілі 3192 чалавекі [3, л. 62– 63].

Хуткі рост сеткі агульнаадукацыйных школ, які адбываўся пасля поўнага вызвалення тэрыторыі Беларусі ад захопнікаў, патрабаваў усё большай колькасці настаўнікаў. Падрыхтаваць іх у сціслыя тэрміны праз дзённую форму навучання ў інстытутах і педагагічных вучылішчах было немагчыма. Менавіта таму СНК БССР 9 кастрычніка 1944 года прыняў пастанову за № 655 “Аб аднаўленні сеткі завочнай педагагічнай адукацыі” [4, л. 246]. Паводле гэтага дакумента, пры ўсіх педагагічных навучальных установах як інстытутах, так і педагагічных вучылішчах была арганізавана завочная падрыхтоўка настаўнікаў.

Пасля пераможнага завяршэння Вялікай Айчыннай вайны пашырэнне сеткі педагагічных навучальных устаноў у рэспубліцы працягвалася.

У 1945/46 навучальным годзе колькасць школьных педагагічных вучылішчаў узрасла на тры вучэбныя ўстановы. Яны былі адкрыты ў Калінкавічах, Пружанах і Ганцавічах [2, л. 12].

З кастрычніка 1945 г. пачаў функцыянаваць Брэсцкі настаўніцкі інстытут [6, л. 194]. У чэрвені 1947 г. Мінскі настаўніцкі інстытут быў рэарганізаваны ў самастойную педагагічную навучальную ўстанову і пераведзены ў г. Маладзечна з мэтай забеспячэння настаўнікамі школ Маладзечненскай вобласці [7, л. 145].

У жніўні 1949 года ўрадам рэспублікі была прынята пастанова “Аб усеагульным абавязковым сямігадовым навучанні ў БССР”. З мэтай падрыхтоўкі настаўнікаў для V–VII класаў Савет Міністраў БССР 24 красавіка 1949 г. прыняў пастанову “Аб мерапрыемствах па забеспячэнні школ рэспублікі педагагічнымі кадрамі ў сувязі з увядзеннем сямігадовага навучання” [8, л. 160]. У адпаведнасці з пастановай была праведзена праца па стварэнні ў рэспубліцы новых педагагічных і настаўніцкіх інстытутаў, адкрыцці новых факультэтаў і аддзяленняў, павелічэнні планаў прыёму студэнтаў.

З 1949/50 вучэбнага года ў г. Бабруйску стаў функцыянаваць новы настаўніцкі інстытут. У кастрычніку 1950 г. адкрываецца і пачынае падрыхтоўку настаўнікаў Брэсцкі педагагічны інстытут.

Такім чынам, у выніку адукацыйнай палітыкі, якая праводзілася кіраўніцтвам рэспублікі ў першыя пасляваенныя гады, у Беларусі да 1950 года была створана шырокая сетка педагагічных навучальных устаноў, якая ў значнай меры магла забяспечыць патрэбы ўсіх ступеняў агульнаадукацыйнай школы рэспублікі ў кваліфікаваных настаўніках усіх спецыяльнасцяў. Падрыхтоўку настаўнікаў для V–X класаў агульнаадукацыйных школ забяспечвалі 8 педагагічных інстытутаў (28 факультэтаў) і 7 настаўніцкіх інстытутаў (19 аддзяленняў) [1, л. 31]. Настаўнікаў для пачатковых школ рыхтавалі 24 педагагічныя вучылішчы [9, л. 175–176].

ЛІТАРАТУРА

1. НАРБ. Ф. 42. Воп. 4. Спр. 414.
2. НАРБ. Ф. 4. Воп. 17. Спр. 21.
3. НАРБ. Ф. 4п. Воп. 17. Спр. 44.
4. НАРБ. Ф. 42. Воп. 4. Спр. 266.
5. НАРБ. Ф. 42. Воп. 4. Спр. 276.
6. НАРБ. Ф. 42. Воп. 4. Спр. 261
7. НАРБ. Ф. 42. Воп. 4. Спр. 277
8. НАРБ. Ф. 42. Воп. 4. Спр. 296.
9. НАРБ. Ф. 4п. Воп. 17. Спр. 82.